©ПДУ

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ПАХАВАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ КАНЦА XIX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

***І. В. АЗЕВІЧ,* У. А. ЛОБАЧ**

In the article the author examines the funeral rites of Belarussians from North Belarus at the end of the XIX th – the beginning of the XX th centuries, and the author also analyses it. As a conclusion, a funeral rite is a system of symbolic acts, which were obligatory for every member

Ключавыя словы: пахавальны абрад, традыцыя, сямейная абраднасць, смерць

Тэма актуальная ў сучасным свеце, бо семантычны агляд традыцыйнага пахавальнага абраду беларусаў дае нам магчымасць высветліць светапогляд нашых продкаў, дазваляе высветліць асноўныя рысы этнічнай ментальнасці у цэлым. Традыцыі кожнага народа складваюцца вякамі, тысячагоддзямі і передаюцца з пакалення ў пакаленне як неад’емная частка ўкладу жыцця чалавека, якая хутчэй у многім і вызначае гэты ўклад. Ва ўсе часы ўсё, што тычыцца паняцця “традыцыйнае” свята захоўвалася ў народзе як найдаражэйшая спадчына, бо любая традыцыя ў першую чаргу задавальняе духоўны густ і патрэбу чалавека [1, с. 7]. Як сведчыць гістарычная рэчаіснасць, народныя традыцыі нельга наўмысна ні выжыць, ні падмяніць, ні забараніць, акрамя тых выпадкаў, калі яны свядома губляюцца і адыходзяць у нябыт у этнічнай памяці, як аджыўшае і непатрэбнае звяно ў культурным укладзе жыцця [1, с. 8]. Сямейныя абрады выконваліся (і выконваюцца) ў пераломныя моманты жыцця, таму ў іх сфакусіраваны самыя характэрныя рысы рытуалу наогул. Аб’яднаць гэтыя абрады ў адзін цыкл дазваляе і агульнасць іх сімволікі [2, с. 96].

Пахавальны абрад – гэта традыцыйны абрад. Паколькі традыцыя з’яўляецца найбольш устойлівай і менш схільнай да трансфармацыі плынню ў народным жыцці, то і традыцыйныя абрады менш за ўсё паддаюцца пэўным новаўвядзенням ці змяненням [3, с. 18]. Абрад пахавання мае доўгую гісторыю свайго існавання. Як тысячу год таму, так і ў сучасным свеце, чалавек не змог зразумець таямніцу самой смерці: чаму яна прыходзіць, забірае таго ці іншага чалавека, і што чакае чалавека па-за гэтым светам. Таму ў народзе і кажуць: “Шукаць смерці не трэба, сама прыйдзе”. Чалавек на працягу ўсяго жыцця сустракаецца з гэтай з’явай на кожным кроку, і таму цесная сувязь “света жывых” з “замагільным светам” спрыяе ўзнікненню паважлівых адносін да памерлых продкаў [4, с. 155]. Продкі беларусаў ўяўлялі жыццёвы кругазварот бясконцым, дзе смерць успрымалася такім жа пераходам ад адной формы існавання да другой, як нараджэнне і вяселле. Таму тут дзейнічалі тыя ж адшліфаваныя стагоддзямі традыцыі, якія пэўным чынам будавалі абрадавую рэчаіснасць, прадпісваючы кожнаму члену сям’і, рода, вясковай абшчыны структуру абрадавых паводзін [5, с. 253].

Сямейныя абрады і звычаі аб’ядноўвалі і ўмацоўвалі сям’ю, служылі своеасаблівым механізмам для перадачы этнічных традыцый, маральна-этычных норм і прынцыпаў ад старэйшых пакаленняў да малодшых. Яны дапамагалі кожнай канкрэтнай сям’і з годнасцю адзначаць такія важныя падзеі, як нараджэнне дзіцяці і ўступленне маладых у шлюб, або зняць эмацыянальна-псіхічнае напружанне ў выпадку смерці каго-небудзь з блізкіх, з павагай да жывых і нябожчыка пахаваць і памянуць яго [2, с. 99].

### Літаратура

1. *Сысоў У. М.* З крыніц прадвечных. – Мн.: Выш. шк., 1997. –
2. *Казакова І.* На парозе жыцця: агульнасць сімволікі сямейна-абрадавага комплексу беларусаў // Роднае слова. – 009. - №1. – с. 96-99
3. *Сысоў У.* Беларуская пахавальная абраднасць. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – 182с.
4. *Лобач У.А.* Этнаграфія Беларусі: Вучэбна-метадычны комплекс для студ. спец.1-21 03 01 “Гісторыя”. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.
5. *Васілевіч У. Л.* Беларуская міфалогія: Дапам. – Мн.: Універсітэцкая, 2001. – 208 с.

©БГУ

# ФЕНОМЕНОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ В «СИСТЕМЕ ТРАНСЦЕНДЕНТАЛЬНОГО ИДЕАЛИЗМА» ШЕЛЛИНГА

***И. В. БАЙДАКОВ***

The research states the necessity of accounting the view point for correct interpretation of “System of transcendental idealism”. Schelling's phenomenological position infers the division of consciousness to pure initial consciousness and final philosophers consciousness. The proposed division in the analysed treatise of Schelling helps in understanding the work because is similar to separation of Odysseus's and Homer's view points in the Odyssey

Ключевые слова: Шеллинг, феноменология, «Система трансцендентального идеализма», одиссея

Кант в «Критике чистого разума» придерживался корреспондентской теории истины, т.е. он предполагал наличие гармонического соответствия наших представлений вещам вне нас. Это послужило поводом для обвинения мыслителя в психологизме. Для решения вопросов, которые возникли после